# АНАЛІЗ МАСТАЦКАГА ТВОРА. РЭАЛІЗАЦЫЯ ЛІТАРАТУРАЗНАЎЧАГА І ДЗЕЙНАСНАГА ПАДЫХОДАЎ

*М.І. Сянкевіч*

З шэрагу задач, якія павінны вырашацца ў працэсе навучання літаратурнаму чытанню ў пачатковай школе найбольш важнай, на нашу думку, уяўляецца задача “*фарміравання сістэмы чытацкіх уменняў і літаратурных уяўленняў вучняў, неабходных для паўнавартаснага ўспрымання літаратуры як мастацтва слова і разумення мастацкіх твораў і навукова-пазнавальных тэкстаў”.* Як бачым, паводле існуючых праграм, задачы фарміравання сістэмы чытацкіх уменняў і літаратурных уяўленняў вучняў стаяць у адным радзе. Малодшыя школьнікі на практычным узроўні (ці ўзроўні ўяўленняў) атрымліваюць элементарныя веды з вобласці літаратуразнаўства, якія неабходныя для засваення літаратуры як слоўнага мастацтва. І гэта не толькі разуменне асобных паняццяў – “аўтар”, “верш”, “рыфма” і інш. Пачынаючыя чытачы далучаюцца да мовы мастацкай літаратуры, вучацца разумець ролю вобразна-выяўленчых сродкаў мовы.

Адна з праблем, з якой надзвычай часта сустракаюцца студэнты-практыканты і маладыя настаўнікі – няўменне рэалізаваць на практыцы дыферэнцыраваны *літаратуразнаўчы* падыходу да аналізу мастацкага твора, няздольнасць асэнсаваць філалагічны, філасофскі, псіхалагічны аспект паняццяў “мастацкі твор”, “мастацкі вобраз”, “мастацкае ўспрыманне”. А без гэтага нельга сфарміраваць чытацкія (і маўленчыя) уменні вучняў, асноўныя з якіх:

– вызначэнне тэмы і галоўнай думкі твора (аўтарскай задумы);

– выяўленне адносін аўтара да героя, яго ўчынкаў (уменне “бачыць” аўтара ;

– выказванне ўласных адносін да дзеючых асоб, іх учынкаў, зместу твора.

Па нашым разуменні, літаратуразнаўчы падыход павінен ісці поруч з *дзейнасным,* пры якім засваенне эстэтычнага зместу мастацкага твора адбываецца шляхам фарміравання ўсіх структурных кампанентаў чытацкай дзхейнасці і вучань разглядаецца як суб’ект дзейнасці і зносін.

Рэалізацыя дзейнаснага падыходу да аналізу мастацкага твора дае магчымасць настаўніку стаць як на пазіцыю дзіцяці, з якім трэба разглядаць узор мастацтва слова, так і на пазіцыю даследчыка і метадыста, які вытлумачвае (інтэрпрэтуе) дадзены тэкст. Кожная з названых вышэй пазіцый цяжкая па-свойму. Складанасці першай (*настаўнік – вучань*) у наступным: настаўніку трэба мець выразнае ўяўленне пра тое, якія цяжкасці ўзнікаюць у малодшых школьнікаў пры ўспрыманні мастацкага твора, як можна дапамагчы вучням іх пераадолець. Іншымі словамі, ён павінен грунтоўна разбірацца ў псіхалагічных асаблівасцях успрымання мастацкага твора малодшымі школьнікамі. Таму творча працуючы

настаўнік, які не задавальняецца ведамі, набытымі падчас навучання ў ВНУ, павінен імкнуцца да мэтанакіраванага папаўнення псіхалагічных ведаў.

Цяжкасці другой пазіцыі (*настаўнік – метадыст)* заключаюцца ў тым, што педагогу неабходна не толькі мець сур'ёзныя літаратуразнаўчыя веды, але і валодаць уменнем актыўна іх выкарыстоўваць як у працэсе самастойнага ўдумлівага прачытання твора "пад лінгвістычным мікраскопам" (М.М. Шанскі), так і ў працэсе аналізу яго на ўроку. Пазіцыя даследчыка і метадыста – гэта найперш пазіцыя *кваліфікаванага чытача, настаўніка*, які здольны арганізаваць калектыўны пошук на ўроку літаратурнага чытання.

Давайце сумесна рашым шэраг метадычных задач, рашэнне якіх, думаецца, паспрыяе рэалізацыі літаратуразнаўчага і дзейнаснага падыходаў да навучэння малодшых школьнікаў аналізу мастацкага твора. Такія задачы "маюць сваёй прадумовай самастойны пошук вырашэння метадычнай праблемы, які праводзіцца з улікам зададзеных умоў без дапамогі збоку" [2, с.59]. Яны з'яўляюцца адным са сродкаў фарміравання прафесійных уменняў педагогаў, бо мадэлююць сітуацыі, у якіх ён можа апынуцца на ўроку.

Спачатку некалькі задач, дзе неабходна *ацаніць гатовае рашэнне*. Напрыклад, у падручніку "Літаратурнае чытанне" для 4-га класа школ з рускай мовай навучання [1, с.70] пасля верша Якуба Коласа "На рэчцы" пастаўлены пытанні: "Як трэба сябе паводзіць на рэчцы зімою?" і "Якую небяспеку тоіць рака?". Паспрабуем даць абгрунтаваную метадычную ацэнку прыведзеным пытанням. (Адказы, па нашым перакананні, павінны зводзіцца да таго, што мастацкі твор нельга разглядаць як ілюстрацыю да з'яў паўсядзённага жыцця. Па гэтай прычыне прыведзеныя пытанні нельга лічыць прымальнымі.)

А цяпер трэба выбраць аптымальнае рашэнне метадычнай задачы з некалькіх прапанаваных: ацаніць вартасці двух відаў падрыхтоўчай працы перад успрыманнем верша Якуба Коласа "Першы гром" (прыклады ўзяты намі са студэнцкіх распрацовак урокаў).

*Варыянт першы.* Настаўнік праводзіць уступную гутарку наступнага зместу. "Дзеці, сёння мы пазнаёмімся з вершам Якуба Коласа "Першы гром". Раскажыце, што вы ведаеце пра пісьменніка? З якімі яго творамі мы пазнаёміліся? (Выслухоўваюцца адказы вучняў.) Кожнае слова народнага паэта – гэта цэлы малюнак. Яго вершы чытаюцца лёгка, яны зразумелыя ўсім. Слухайце ўважліва, звярніце ўвагу на тэмп чытання".

*Варыянт другі.* Настаўнік правярае вуснае дамашняе сачыненне "Якой я бачыў навальніцу". Адказы дзяцей удакладняюцца пытаннямі: "Адкуль вы назіралі за навальніцай?", "Які быў дождж?", "З чым можна параўнаць раскаты грому?", "Якога колеру было неба?". Пасля гэтага педагог прапануе паслухаць, якім пачуў першы гром Якуб Колас, заўважыць адметнасць вымаўлення асобных слоў.

(Бясспрэчна, што другі варыянт больш выйгрышны: развіваецца звязная вусная мова вучняў, узбагачаецца слоўнікавы запас, абуджаецца эмацыянальная памяць, вучні рыхтуюцца да непасрэднай сустрэчы з узорам мастацтва слова.)

Яшчэ адна метадычная задача: ацаніць кожную з установак, якія былі дадзены настаўнікам перад першасным чытаннем верша Якуба Коласа “Адлёт жураўлёў”.

1. Слухайце ўважліва і пастарайцеся заўважыць, чым адрозніваецца апісанне восені ў вершы Якуба Коласа і ў яго апавяданні “Асеннія ясныя дні”?

2. Паслухайце верш і заўважце, як паступова мяняецца тэмп чытання.

(Думаецца, першае заданне поўнасцю непрымальнае, бо ад вучняў патрабуецца не толькі слухаць, але і рашаць задачы на параўнанне, супастаўленне. Мы пагаджаемся з тымі метадыстамі, якія лічаць, што непасрэднаму ўспрыманню мастацкага твора наогул не павінны папярэднічаць ніякія заданні.)

Цяжкасць метадычных задач павялічваецца, калі іх рашэнне вымагае *самастойнай распрацоўкі*. Ніжэй намі прыведзены прыклады падобных задач (па нарастанні цяжкасці), якія могуць быць выкарыстаны выкладчыкамі “Методыкі беларускай мовы і літаратурнага чытання” ВНУ, курсаў павышэння кваліфікацыі і інш.

1. З апавядання выберыце словы, якія патрабуюць тлумачэння. Падумайце, якія групы слоў трэба растлумачыць да чытання, пасля першаснага чытання, у працэсе аналізу. Абгрунтуйце свой выбар.

2. Вызначце галоўную ідэю абагульняльнага ўрока па тэме “Радзіма мая дарагая…” У сувязі з выбранай ідэяй адбярыце творы для якіх трэба звярнуцца на ўроку. Прадумайце метадычныя прыёмы і магчымыя творчыя заданні.

3. Распрацуйце фрагмент урока па тэме “З рога ўсяго многа”, укажыце асноўную задачу, якая будзе выпрашацца.

4. Правядзіце літаратуразнаўчы аналіз верша Канстанцыі Буйло “Люблю наш край”. Абапіраючыся на яго, распрацуйце канспект урока.

5. У чым асаблівасць пабудовы сінтаксічных канструкцый у вершы Якуба Коласа “Адлёт жураўлёў? Якім чынам настаўнік павінен улічыць гэтую асаблівасць твора пры рабоце з ім на ўроку? Прапануйце сістэму пытанняў пры аналізе эстэтычнага зместу верша.

Такім чынам сучасны ўрок літаратурнага чытання патрабуе ад настаўніка адпаведнай літаратуразнаўчай і глыбокай псіхолага-педагагічнай падрыхтоўкі, без чаго немагчыма вырашэнне задач, якія стаяць перад вучэбным прадметам “Літаратурнае чытанне” ў школе.

У якасці дадатку да артыкула прапануем разгорнуты план-канспект урока літаратурнага чытання.

Тэма: Апавяданне Васіля Хомчанкі “Трывожны чамадан”

(А. Клышка, “Літаратурнае чытанне” для 4 класа школ з рускай мовай навучання)

Мэты ўрока:

1. Дапамагчы вучням зразумець ідэйна-вобразны змест апавядання Васіля Хомчанкі “Трывожны чамадан”.
2. Удасканальваць уменне дзяліць тэкст на часткі і складаць план прачытанага.
3. Удасканальваць навыкі выразнага чытання.
4. Вучыць дзяцей творчым відам пераказаў.
5. Вучыць дзяцей заўважаць, якую ролю адыгрываюць моўныя сродкі, мастацкая дэталь у раскрыцці аўтарскай задумы.
6. Выхоўваць павагу да роднай літаратуры, прыахвочваць дзяцей да чытання кніг беларускіх аўтараў.

Ход урока

1. *Арганізацыйны момант*
2. ***Уступная праца** ( варыянты):*

а) настаўнік гаворыць пра свята абаронцаў Айчыны, пра важнасць прафесіі ваеннага;

б) дзеці спрабуюць па назве спрагназаваць, пра што будзе апавяданне;

в) вучні, у якіх бацькі афіцэры, расказваюць, што такое трывожны чамадан, навошта ён патрэбен.

***2. Першаснае ўспрыманне:** ( варыянты)*

а) чытаюць загадзя падрыхтаваныя вучні;

б) чытае настаўнік і 2, 3 вучні, якія добра валодаюць тэхнікай чытанняю.

***3. Аналіз першаснага ўспрымання:***

– Якія незнаёмыя словы сустрэліся ў апавяданні?

– Пра што вы думалі, чытаючы апавяданне?

– Ці ўсё вам было зразумела? Пра што вы хочаце запытаць у мяне?

– Выберыце словы, каб сказаць, якое гэта апавяданне? Чаму вы так рашылі? (сумнае, добрае, шчырае……..)

***4. Паўторнае чытанне***

*(Апавяданне чытаецца “ланцужком”; апошнюю старонку можна прачытаць з выкарыстаннем прыёму “вулей” – кожны вучань чытае ўпаўголаса ў сваім тэмпе.)*

***5. Аналіз зместу твора***

– Чаму бацькаў чамадан захоўваецца пад ложкам, а не ў шафе ці кладоўцы?

– Знайдзіце і прачытайце, якія рэчы знаходзяцца ў чамадане?

– Якія назвы прадметаў вам не зразумелыя?

– Знайдзіце і прачытайце пра прызначэнне кожнага з прадметаў.

– Знайдзіце і прачытайце, што рабіў бацька па трывозе? *(чытаюць некалькі чалавек; інтанацыя клічнага сказа).*

– Дакажыце словамі тэксту, што Міхаська вельмі любіць бацьку.

– Дакажыце словамі тэксту, што ў сям'і хлопчыка тату паважаюць усе.

– Прачытайце, які падарунак зрабіў хлопчык.

– Прачытайце пісьмо Міхаські так, нібыта гэта вы напісалі свайму бацьку.

– Дакажыце, што бацька з павагай адносіцца да жонкі і дзяцей? Якія словы пра гэта гавораць? (*ціхенька* адзеўся; канвертаў нават *не хапіла).*

– Паглядзіце на малюнкі. Якія моманты адлюстраваў мастак? Ці не памыліўся ён?

– Якія словы гавораць пра тое, што бацька адносіцца да Міхаські па-мужчынску, амаль як да дарослага?

**6. *Падвядзенне вынікаў аналізу; вызначэнне аўтарскай задумы***

Перачытайце прадапошні абзац і скажыце: чаму абрадаваўся хлопчык? *(Настаўнік выслухоўвае адказы вучняў, падводзіць іх да думкі: Міхаська рады таму, што прынёс радасць роднаму чалавеку. Настаўнік абагульняе адказы вучняў .*

**7. *Складанне плана і пераказ***

– Падумайце, на колькі частак можна падзяліць твор.

– Пра што трэба абавязкова сказаць упачатку?

– Як назавем гэты пункт плана? *(Татаў чамадан)*

– Якімі словамі пачынаецца наступная частка?

– Дзе яна заканчваецца?

– Як назавем гэты пункт плана? *(Неспакойная служба)*

– Пра што гаворыцца ў трэцяй частцы?

– Якімі словамі яна заканчваецца?

– Дайце назву гэтай частцы. *(Пяць канвертаў; Міхаськаў падарунак)*

– Прачытайце апавяданне да канца і дайце назву апошняй частцы. *(Татава падзяка; Міхаськава радасць; Канверты спатрэбіліся)*

**8. *Падрыхтоўка да пераказу і пераказ па плану*** *(варыянты)*

*(а) па частках; б) толькі асобныя часткі па выбару; в)найбольш важную частку)*

**9. *Творчы пераказ***

а) працяг апавядання за аўтара (які падарунак мог прывезці бацька?);

б) пераказ апавядання ад імя бацькі-афіцэра;

в) творчае дапаўненне: бацька радуецца Міхаськаваму падарунку.

**10. *Падвядзенне вынікаў урока***

– Што хацеў нам сказаць аўтар?

– Якім чалавекам вырасце Міхаська? Чаму вы так лічыце?
– Што вы можаце сказаць пра аўтара апавядання

Літаратура

1. Клышка, А., Літаратурнае чытанне. Падручнік для 4 класа агульнаадукац. устаноў з рускай мовай навучання / А. Клышка. – Мінск : НІА, 2008. – 128 с.
2. Соловейчик,М.С. Совершенствование подготовки учителей начальных классов / М.С. Соловейчик // Начальная школа. – 1987. – № 1. – С. 59